# У ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ БУДЗЕ ПРЭТЭНДАВАЦЬ 265 КАНДЫДАТАЎ, У МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ — 18 802

## Рэгістрацыя завершана, пачалася агітацыя

**Акруговыя камісіі правялі рэгістрацыю кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і мясцовых Саветаў дэпутатаў. Аб гэтым журналістам расказаў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА.**

Такім чынам, на 110 дэпутацкіх месцаў Палаты прадстаўнікоў на сённяшні момант будзе прэтэндаваць 265 кандыдатаў. «З іх моладзі — грамадзян да 31 года —— дзесяць прэтэндэнтаў, — удакладніў старшыня Цэнтрвыбаркама. — Самаму маладому кандыдату ў дэпутаты 23 гады. Сярод кандыдатаў у дэпутаты — 92 жанчыны. Мы бачым, што мужчыны праявілі большую актыўнасць па вылучэнні сваіх кандыдатур у склад парламента. Акрамя таго, вылучаюцца чатыры пенсіянеры. Самаму сталаму кандыдату ў дэпутаты 66 гадоў. Адзін чалавек — беспрацоўны. У цэлым, конкурс на месца ў Палату прадстаўнікоў складае 2,4 чалавека на месца».

Што датычыцца мясцовых Саветаў дэпутатаў, то на 12 514 месцаў будзе прэтэндаваць 18 802 прадстаўнікі. Па словах Ігара Карпенкі, і тут ёсць пэўны конкурс. Пры гэтым ён адзначыў, што традыцыйна ў некаторых Саветах, у першую чаргу сельскіх, выбары праходзяць безальтэрнатыўна.

Як адзначыў старшыня ЦВК, у працэсе вылучэння кандыдатаў у дэпутаты праявілі актыўнасць палітычныя партыі. «Больш за ўсё кандыдатаў у дэпутаты вылучыла беларуская партыя «Белая Русь», — канкрэтызаваў Ігар Карпенка. — На другім месцы — Ліберальна-дэмакратычная партыя. На трэцім — Камуністычная партыя Беларусі. І на чацвёртым — Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці».

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі нагадаў, што з 31 студзеня пачаўся перыяд агітацыі. «Зарэгістраваныя кандыдаты змогуць скарыстацца сваім канстытуцыйным і выбарчым правам і данесці да ведама выбаршчыкаў свае перадвыбарныя праграмы, правесці сустрэчы, выступіць у сродках масавай інфармацыі, правесці масавыя мерапрыемствы з мэтай прыцягнення выбаршчыкаў як на выбарчыя ўчасткі, так і на галасаванне за канкрэтнага кандыдата ў дэпутаты», — адзначыў ён.

Пры гэтым Ігар Карпенка нагадаў, што ў перыяд правядзення агітацыі Выбарчы кодэкс гарантуе ўсім роўныя правы і магчымасці. «Мясцовыя органы ўлады ўстанавілі месцы правядзення масавых мерапрыемстваў, сустрэч з выбаршчыкамі, месцы, дзе можна размяшчаць друкаваныя матэрыялы, праграмы, — канстатаваў старшыня Цэнтрвыбаркама. — ЦВК вынес адпаведную пастанову на выдзяленне эфірнага часу на радыё і тэлебачанні для кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Разам з тым кандыдаты са сваіх фондаў таксама могуць аплаціць дадатковыя крыніцы інфармацыі як у лічбавых сродках масавай інфармацыі, так і ў друкаваных СМІ. Пры гэтым варта разумець, што кандыдаты ў дэпутаты павінны знаходзіцца ў роўных умовах».

У адпаведнасці з заканадаўствам аб масавых мерапрыемствах, кандыдаты ў дэпутаты могуць ва ўстаноўленыя тэрміны падаць заяўку на правядзенне масавых мерапрыемстваў. Пры гэтым, як падкрэсліў Ігар Карпенка, забаронена агітацыя, якая заклікае выступаць супраць канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, да яго гвалтоўнага звяржэння, ігнараваць і не хадзіць на выбары, а таксама агітацыя, якая сее нацыянальную, расавую, этнічную і сацыяльную варожасць.

Падрабязную інфармацыю аб усіх этапах выбарчага працэсу можна знайсці на сайце Цэнтральнай выбарчай камісіі.

**Вераніка КАНЮТА.**